# Асаблівая місія ахоўных тэрыторый

**Сёння экатурызм - тэта не проста цікавы адпачынак. Гось, які ідзе па экасцежцы заказніка, удзельнічае ў майстар-класе, гутарыць з людзьмі, якія там працуюць, атрымлівае карысныя веды і неўпрыкмет пераймае нормы паводзін. Калі на маршруце стаяць сметніцы ці кантэйнеры для асобнага збору адходаў, у турыста не з'яўляецца жадання кінуць паперку на зямлю. Сустрэчы з людзьмі, якія клапоцяцца аб захаванні прыродных тэрыторый, вывучаюць флору і фаўну, уплываюць на свядомасць чалавека: у іншых месцах ён таксама ўжо будзе беражліва ставіцца да ўсяго жывога. Заказнікі могуць прывіваць нават здаровыя звычкі - чалавек будзе імкнуцца набываць прадукцыю з экалагічна чыстых тэрыторый.**

**Аб гэтым і не толькі пагутарылі на семінары «Лепшы вопыт і нрактыка супрацоўніцтва на мясцовым ўзроўні па развіцці экатурызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях», які прайшоў у Расонах і ладзіўся пры фінасавай падтрымцы Расійскай Федэрацыі.**

Семінар - адзін са складнікаў вялікага ираекта ПРААН «Развіццё экалагічнага турызму для садзеяння зялёнаму пераходу да інклюзіўнага і ўстой- лівага росту», які рэалізуецца ў партнёрстве з Міністэрствам природы і аховы навакольнага ася- роддзя Рэспублікі Беларусь.

**Прапановы для гасцей**

Праект ПРААН прадугледжвае не толькі стварэнне ўмоў для развіцця турызму на тэрыторыі заказнікаў. Па сутнасці дзякуючы яму пакрысе мяняецца жыццё рэгіёнаў, дзе знаходзяцца пілотныя заказнікі, для якіх рас- працоўваюцца пэўныя стратэгіі развіцця. Ствараюцца новыя тур- прадукты, кластары, куды ўва- ходзяць розныя ўстановы і арганізацы. Так, у рамках праекта ПРААН на тэрыторыі Расонскага раёна з'явіўся экатурыстычны кластар «Эка-Росы», куды ўвайшлі два заказнікі, установы. адукацыі, дом рамёстваў і раённыя дамы культуры. Арганічна ў дзённага прыбывання для людзей з інваліднасцю і грамадзяп старэй- шага ўзросту, падапечныя якога не толькі адпачываюць на тэрыторыі заказніка, але і выrабляюць адмет- ны сувенір-ляльку «Расоначка».

Дарэчы, экатурыстычныя кластары ў межах праекта ствараюцца на тэрыторыі ўсіх пілотных заказнікаў. Так вакол асабліва ахоўнай тэрыторыі (ААТ) збі- раецца каманда аднадумцаў, ку- ды могуць уваходзіць найболын зацікаўленыя арганізацыі, дзяржаўныя ўстановы, актывісгы, прыватны бізнес. Дзякуючы такому супрацоўніцтву з'яўляюцца новыя маршруты: пасля паходаў госці могуць наведаць музеі, далучыцца да культурнай праграмы, паўдзельнічаць у майстар- класах, якія праводзяць супрацоўнікі дома рамёстваў, пазнаёміцца з культурна- гістарычнай спадчынай, пабываць на вытворчай экскурса, напрыклад, на заводзе, дзе вырабляюцца сыры. На кожным пункце будзе давацца рэклама як самой ААТ, так і калег на экакластары. Пашырэнне паслуг, з аднаго боку, дазваляе прывабіць больш турыстаў, з другога, можа мець ахоўны эфект. Дзякуючы дадатковым паслугам можна кіраваць патокам гасцей, кантраляваць нагрузкі на ахоўныя прыродныя тэрыторыі. Да таго ж у турыста, калі ён заняты на майстар-класе, экскурсіі ці канцэрце, няма часу на тое, каб здзейсніць «несанкцыяваную» вылазку па прыродных тэрыторыях ці развесці вогнішча, там дзе не трэба.

**Добраахвотныя памочнікі**

У Роберта Раждзественскага ёсць радкі «Всё меньше - окружающей природы. Всё больше - окружающей среды», - ўздыхае га- лоўны спецыяліст Дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Эка- Росы» Стэфанія ЛІСІЧОНАК. Каб тэты працэс спыніць, трэба аб'ядноўваць намаганні.

- Экаасвета - адзін з самых важных

кампанентаў экатурызму. Задача спецыялістаў ААТ - пра- цаваць з людзьмі такім чынам, каб яны разумелі каштоўнасць і ўнікальнасць прыродных тэрыторый, пераасэнсоўвалі тэту інфармацыю і трансліравалі яе», - сцвярджае дырэктар Нацыяналь- нага парка «Себежскі» (Расія) **Надзея ПАДАПЛЁКІНА**, адзін з экспертаў семінара.

У межах праекта ПРААН у раёнах, дзе размяшчаюцца заказнікі, якія ўключыліся ў новую праграму па развіцці экатурызму, пачалі стварацца экалагічныя клубы. Адзін з іх дзейнічае ў Расонскім раёне пры школе ў Клясціцах. Дзеці прыязджаюць ў валанцёрскія лагеры, водзяць экскурсіі, далучаюцца да інклюзіўных мерапрыемстваў, нават самастойна арганізавалі квэст для людзей з інваліднасцю. Падобная праца з падрастаючым пакаленнем дазваляе рыхтаваць грамадскіх эколагаў, а магчыма, і будучых супрацоўнікаў прырода-ахоўных тэрыторый.

Таксама ў Расонах актыўна развіваецца валанцёрскі рух. Менавіта добраахвотнымі памочнікамі зроблены рамонт візіт-цэнтра заказніка. Валанцёры распрацавалі і абсталявалі дзевяць турыстычных маршрутаў, гатовы выступіць масавікамі-забаўнікамі для юных гасцей ААТ, праводзіць зарадкі і май- стар-класы.Такім чынам праект дае магчымасць кожнаму праявіць свае здольнасці ў розных кірунках.

Карыснымі для заказніка былі б і блогеры. Яны маглі б прыцягнуць увагу да ААТ, распавядаю- чы пра маршруты і дапамагчы ў стварэнні сайта заказніка.

**Супрацоўніцтва з мясцовым насельніцтвам**

Адна з тэм, якая асвятлялася падчас семінара — прыцягненне мясцовага насельніцтва да экатурызму на ААТ. Удзельнікі су- стрэчы пагадзіліся, што жыхары не павінны ўспрымаць заказнік як тэрыторыю, са стварэннем якой з'явіліся пэўныя забароны і быў парушаны ранейшы вясковы ўклад. Экатурызм дазваляе фарміраваць стаўленне да такіх тэрыторый як да месца, што адкрывае для мясцовых жыхароў новыя магчымасці, у тым ліку фінансавыя. Штаты заказнікаў невялікія і дапамога ў працы з ту- рыстамі ніколі не будзе лішняй. Важна толькі стварыць умовы, у якіх мясцовыя жыхары змогуць са- марэалізавацца. Напрыклад, ства- раючы сувенірную прадукцыю, прымаючы ўдзел у абслугоўванні турыстаў, разнастайных мерапры- емствах, якія праходзяць на ААТ.

- Некалькі апошніх гадоў мы актыўна працуем з мясцовым насельніцтвам. Праводзім семінары, экалагічны фестываль «Асвейскія росы», дзе можна пачаставацца стравамі нацыянальнай кухні, па- ўдзельнічаць у культурнай пра- граме, - падзяліўся вопытам дырэктар рэспубліканскага ландшаф- тнага заказніка «Асвейскі» Ігар РАМАНЮК. - Да нас прыязджаюць гараджане, якім хочацца на- туральных прадуктаў. Восенню турысты актыўна закупляюць ягады і грыбы. Нават калі гасцям захочацца свежай рыбы, можна іх звязаць з мясцовымі рыбакамі. Калі ў тутэйшага жыхара ёсць лодка ці, як у адной з аграсядзіб - плывучы пантон, мы сунрацоўнічаем, каб абслугоўваць большую колькасдь турыстаў. Напрыклад, для мяне праблематычна на 6 гадзін кінуць усе справы і павезці гасцей на рыбалку. Таму мы прыцягваем мясцовае насельніцтва па дагаворах у якасці матарыстаў (для кіравання плывучымі сродкамі магутнасцю звыш 5 конскіх сіл патрэбныя правы. - *Заўв.рэд.).*

На жаль, пэўны час насельніцтва ў гэтым рэгіёне імкліва памяншалася, старыя людзі паміралі, а моладзь з'язджала ў пошуку працы. Экатурызм дае новыя надзеі, што з яго развіццём зменшыцца адток насельніцтва, створацца новыя працоўныя месцы.

**Унікальны турпрадукт**

Як расказаў кіраўнік праекта ПРААН «Развіццё экалагічнага турызму для садзеяння зялёна- му пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту» **Аляксандр СВІДЗЕРСКІ**, з 2021 года ў нашай краіне рэалізуецца комплексная праграма, у якой задзейнічаны ААТ. Праект уключае некалькі кірункаў: навучанне, распрацоўку стратэгічных і метадычных да- кументаў, тэхнічнае аснашчэнне. Па кожнаму з іх ужо праведзена вялікая работа. Былі падрыхтаваны экскурсаводы, якія будуць працаваць на ААТ для чатырох пілотных заказнікаў «Азёры», «Налібоцкі», «Асвейскі» і «Чырвоны бор». Супрацоўнікі

12 заказнікаў прайшлі праграму павышэння кваліфікацыі па тэме «экатурызм» і атрымалі пасведчанні дзяржаўнага ўзору. Лакальныя трэнінгі праводзіліся на месцах асобных заказнікаў, падчас якіх разглядаліся пытанні арганізацыі экскурсійнай дзейнасці, інтэрпрэтацыі культурна-гістарычнай спадчыны, асаблівасці работы з людзьмі з інваліднасцю пры правядзенні прыродазнаўчых экскурсій. Быў арганізаваны візіт супрацоўнікаў прыродаахоўных устаноў ў Расійскую Федэрацыю з мэтай азнаямлення з пасняховым вопытам калег.

Адна з задач праекта ПРААН - садзейнічанне стварэнню транс- гранічнага маршруту, які пройдзе па тэрыторыі расійскага нацыянальнага парка «Себежскі» і беларускіх заказнікаў «Асвейскі» і «Чырвоны бор». Падрыхтаваны доўгатэрміновыя стратэгіі развіцця экатурызму на тэрыторыі заказнікаў «Азёры», «Асвейскі», «Чырвоны бор», якія ўключаюць пяцігадовыя планы з канкрэтнымі мерапрыемствамі. Таксама для іх распрацаваны віртуальныя туры, з якімі за паўтара года азнаёмілася больш за 20 тыс. чалавек. Рэклама пра пакуль малавядомыя аб’екты спрыяе таму, што частка турыстаў выбірае для адпачынку «навінкі», а не больш раскручаныя і загружаныя прыродныя тэрыторыі.

Плануецца ў межах праекта распрацаваць знак экамаркіроўкі, якая будзе дзейнічаць на тэрыторыі ўсёй краіны, і адзіную сімволіку для прыродаахоўных тэрыторый. Сёння вядзецца праца па стварэнні сістэмы добраахвотнай экалагічнай сертыфікацыі экатурпрадукта, што спачатку будзе апрабавана на практыцы на тэрыторыі пілотных заказнікаў. Дарэчы, у свеце яшчэ вельмі мала краін, дзе ўжо дзейнічае такая сістэма. Знак, які пацвярджае якасць паслуг, што аказваюцца на прыроднай тэрыторыі, таксама будзе садзейнічаць прыцягненню турыстаў.

Што датычыцца сімволікі, тэта можа быць эмблема, якую можна выкарыстоўваць для ўсіх ААПТ.

Напрыклад, на вопратцы су- працоўніка заказніка можа быць адна нашыўка, якая належыць канкрэтнай установе, і другая, што звязана з прыродаахоўнай дзейнасцю,

Таксама плануецца стварэнне інтэрактыўнай карты ўсіх ААПТ, на якую будуць нанесены запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі рэспубліканскага і мясцовага значэння, помнікі прыроды - з кароткімі звесткамі, каардынатамі і спасылкамі на іншыя рэсурсы, дзе можна атрымаць больш падрабязную інфармацыю пра дадзеныя аб’екты.

- Стаўку мы робім на тое, каб на кожнай тэрыторыі стварыць унікальны экатурыстычны пра- дукт, - заўважае Аляксандр Сві- дзерскі. - Так, у заказніку «Азёры» захавалася вузкакалейная дарога, па якой раней вывозіўся торф з месца здабычы да бліжэйшай чы- гуначнай станцыі. Працягласць вузкакалейкі - 11 км, пралягае яна праз розныя прыродныя біято- пы - лугі, лес, верхавое і нізіннае балоты. Сёння яе вырашана вы- карыстаць для незвычайнага пада- рожжа турыстаў - на дрызінах.

У Рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Асвейскі» мес- цам прыцягнсння турыстаў можа стаць востраў Ду - самы вялікі на тэрыторыі Беларусь Ён зай- мае 480 га. Да 70-х гадоў мінулага стагоддзя тут яшчэ жылі людзі, працаваў калгас. Сёння пра мінулае нагадваюць толькі асобныя пладовыя дрэвы, рэшткі фундаментаў і старыя могілкі.

На восграў, дзе цяпер жывуць толькі дзікія жывёлы, турыстаў прывозіць катэр.

Заслугоўвае ўвагі і Асвейскае возера, на якім знаходзіцца Ду.

Па велічыні яно саступае толькі Нарачы. Менавіта на яго беразе плануецца стварыць глэмпінг гламурны кемпінг, дзе турысты размяшчаюцца ў асаблівых кам- фартабельных палатках, у якіх стаяць ложкі, засцеленыя бялізнай. Сёння стаянкі, абсталяваныя такім чынам, даволі папулярныя ў экатурызме. На самім вострave плануецца стварыць турыстычную сцежку, паставіць інсталяцыі, звязаныя з яго прыродай і гісторыяй.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**